Журнал Белорусского государственного университета. История. 2018;4:44–53
Journal of the Belarusian State University. History. 2018;4:44–53

УДК 338(476)(091)«18/19»(043.3)

# ПИВОВАРНЯ С ОСОБЕННОЙ ИСТОРИЕЙ: УЧРЕЖДЕНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ МИНСКОГО ПИВОВАРЕННОГО ЗАВОДА ФРУМКИНЫХ – ЧАПСКОГО – ЛЕКЕРТОВ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

***А. В. БУРАЧОНОК***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

На основе материалов делопроизводства, статистических и законодательных источников Российской империи всесторонне исследуется деятельность одного из крупнейших пивоваренных заводов на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. Выявлены основные этапы в развитии предприятия и их особенности. Приведена социальная характеристика владельцев завода. Отражена роль графа К. Чапского, семейств Фрумкиных и Лекертов в развитии предприятия. На примере конкретного промышленного учреждения показано влияние предпринимательской деятельности на трансформационные процессы в белорусском обществе во второй половине XIX – начале XX в.

***Ключевые слова:*** предпринимательство; Беларусь; промышленность; пивоварение; модернизация; трансформация общества; Российская империя.

# БРОВАР З АДМЕТНАЙ ГІСТОРЫЯЙ: ЗАСНАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ МІНСКАГА ПІВАВАРНАГА ЗАВОДА ФРУМКІНЫХ – ЧАПСКАГА – ЛЕКЕРТАЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***А. В. БУРАЧОНАК***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

На аснове матэрыялаў справаводства, статыстычных і заканадаўчых крыніц Расійскай імперыі ўсебакова даследуецца дзейнасць аднаго з буйнейшых піваварных заводаў на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Выяўлены асноўныя этапы ў развіцці прадпрыемства і іх асаблівасці. Прыведзена сацыяльная характарыстыка ўладальнікаў завода. Адлюстравана роля графа К. Чапскага, сямействаў Фрумкіных і Лекертаў у развіцці прадпрыемства. На прыкладзе канкрэтнай прамысловай установы паказаны ўплыў прадпрымальніцкай дзейнасці на трансфармацыйныя працэсы ў беларускім грамадстве ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

***Ключавыя словы:*** прадпрымальніцтва; Беларусь; прамысловасць; піваварэнне; мадэрнізацыя; трансфармацыя грамадства; Расійская імперыя.

**Образец цитирования:**
Бурачонак АВ. Бровар з адметнай гісторыяй: заснаванне і дзейнасць мінскага піваварнага завода Фрумкіных – Чапскага – Лекертаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2018;4:44–53.

**For citation:**
Burachonak AV. Brewery with distinctive history: establishment and operation of Frumkins' – Chapski's – Lekkerts' Minsk brewing plant in the second half of the XIX – early XX century. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2018;4:44–53. Belarusian.

**Автор:**
***Александр Вячеславович Бурачонок*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета.

**Author:**
***Aliaksandr V. Burachonak***, PhD (history), docent; associate professor at the department of Modern and Contemporary history of Belarus, faculty of history.
*burumag@gmail.com*

# BREWERY WITH DISTINCTIVE HISTORY: ESTABLISHMENT AND OPERATION OF FRUMKINS' – CHAPSKI'S – LEKKERTS' MINSK BREWING PLANT IN THE SECOND HALF OF THE XIX – EARLY XX CENTURY

***A. V. BURACHONAK*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Activity of one of the largest breweries on the territory of Belarus in the second half of XIX – early XX century is thoroughly investigated based on official records, legal and statistical sources of the Russian Empire period. Main stages of enterprises development are revealed and characterized. Social characteristics of the brewery owners are outlined. Special consideration is given to the role that count K. Chapski, Frumkins and Lekkerts families played in enterprise development. The impact which entrepreneurship activities had on transformation processes in Belarusian society in the second half of the XIX – early XX century is demonstrated using the example of specific industrial establishment.

***Key words:*** entrepreneurship; Belarus; industry; brewing; modernization; transformation of society; Russian Empire.

На сучасным этапе развіцця нашай дзяржавы прамысловасць з'яўляецца найбуйнейшай галіной і флагманам эканомікі Рэспублікі Беларусь. Нягледзячы на абмежаванасць уласных паліўна-энергетычных рэсурсаў і важных відаў сыравіны, рэспубліка працягвае захоўваць свой прамысловы патэнцыял. Неабходна адзначыць, што прамысловасць Беларусі мае свае багатыя традыцыі. Шэраг прадпрыемстваў, якія сёння актыўна ажыццяўляюць вытворчасць рознай па сваім характары прадукцыі, былі заснаваны яшчэ ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Сярод іх варта ўзгадаць адно з найбуйнейшых дрэваапрацоўчых беларускіх прадпрыемстваў «Пінскдрэў», якое вядзе адлік сваёй дзейнасці з заснавання ў 1880 г. у Пінску фанернай фабрыкі ганаровымі грамадзянамі Аляксандрам і Леапольдам Лур'е; знакаміты далёка па-за межамі нашай рэспублікі сваімі вырабамі шклозавод «Нёман», гісторыя якога пачалася ў 1883 г. з адкрыццём памешчыкам Зянонам Ленскім невялікай гуты; вядомую многім пакаленням савецкіх і беларускіх школьнікаў сваёй прадукцыяй Добрушскую папяровую фабрыку, якая была заснавана яшчэ ў 1870 г. князем Фёдарам Паскевічам, і шэраг іншых.

Пэўныя аспекты дзейнасці названых прадпрыемстваў у дарэвалюцыйны час ужо знайшлі сваё адлюстраванне ў айчыннай гістарыяграфіі. Разам з тым на сёння ў рэспубліцы налічваецца значная колькасць вытворчых аб'ектаў з багатымі векавымі традыцыямі, якія амаль цалкам застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў эканамічнай гісторыі Беларусі. Да такіх аб'ектаў належыць і завод з гісторыяй больш чым у паўтары стагоддзі, які і сёння працягвае дзейнічаць у Мінску. З 1994 г. дадзенае прадпрыемства мае назву «Аліварыя» і, як і ў другой палове XIX – пачатку XX ст., працягвае спецыялізавацца ў традыцыйнай для беларускіх зямель яшчэ з эпохі Сярэднявечча галіне – вытворчасці піва. Варта адзначыць, што асобныя старонкі дарэвалюцыйнай гісторыі названага завода знайшлі адлюстраванне ў працах З. В. Шыбекі, Н. І. Палятаевай, В. Р. Кукуні [1–3] і інш. Дасягненне пастаўленай аўтарам артыкула мэты – усебакова прааналізаваць працэс заснавання і дзейнасці прадпрыемства Фрумкіных – Чапскага – Лекертаў, выявіць пэўныя адметныя рысы ў яго развіцці – было б немагчыма без выкарыстання дакументаў справаводства, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, матэрыялаў афіцыйнай статыстыкі і крыніц заканадаўчага характару.

Заснаванне разглядаемага піваварнага завода звязана з іменем мінскай мяшчанкі Рохлі Фрумкінай. 28 студзеня 1864 г. яна накіравала прашэнне на імя расійскага імператара Аляксандра II з мэтай атрымаць дазвол на ўзвядзенне будынка з далейшай арганізацыяй там вытворчасці піва. У той жа дзень Рохля Фрумкіна прадставіла ў Мінскую будаўнічую і дарожную камісію Галоўнага ўпраўлення шляхоў зносін і публічных будынкаў Міністэрства шляхоў зносін Расійскай імперыі праект будучага бровара, які быў зацверджаны 29 студзеня 1864 г. Заснаванне новага прадпрыемства планавалася на ўчастку зямлі, які знаходзіўся на перакрыжаванні вуліц Загараднай (сучасная Кісялёва) і Аляксандраўскай (сучасная Максіма Багдановіча)[1]. Варта адзначыць, што гэты зямельны надзел агульнай плошчай звыш 5,33 тыс. м$^2$ па кантракце ад 9 жніўня 1828 г. знаходзіўся ў вечна-чыншавым валоданні бацькі будучай уладальніцы завода – Сімона Мінекера. Пасля яго смерці ўся зямля з пабудовамі перайшла ў спадчыну да яго адзінай дачкі[2].

Атрымаўшы дазвол на заснаванне свайго прадпрыемства, Рохля Фрумкіна не спяшалася яго рэалізаваць. Цягам наступных чатырох месяцаў у першапачатковы праект завода былі ўнесены пэўныя ўдасканаленні, і 21 мая 1864 г. на імя Аляксандра II было накіравана новае прашэнне. Адначасова з гэ-

[1]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 447. Воп. 1. Спр. 211. Арк. 1–4.
[2]Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1553. Арк. 13–14.

тым у Мінскую будаўнічую і дарожную камісію быў прадстаўлены новы чарцёж бровара (мал. 1), які быў зацверджаны 26 мая 1864 г.[3]. Фактычна з гэтага часу можна адлічваць пачатак дзейнасці піваварнага завода Фрумкіных у губернскім горадзе Мінску, у якім у сярэдзіне 1860-х гг. акрамя названага існавала яшчэ шэсць прадпрыемстваў[4], якія спецыялізаваліся ў гэтай галіне.




*Мал. 1.* Схема размяшчэння будынкаў
на зямельным участку Р. Фрумкінай (1864 г.):
1, 2, 7 – драўляныя пабудовы (дамы); 3 – драўляны бровар;
4 – калодзеж; 5 – драўляны навес; 6 – лядоўня.
Крыніца: Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 447. Воп. 1. Спр. 211. Арк. 5

*Fig. 1.* The layout of buildings on the R. Frumkina's land plot (1864):
1, 2, 7 – wooden buildings (houses); 3 – wooden brewery;
4 – water well; 5 – wooden open shed; 6 – ice house.
Source: National Historical Archives of Belarus. F. 447. Inv. 1. F. 211. Sh. 5

Варта адзначыць, што дакументаў, якія ўтрымліваюць пэўныя звесткі аб дзейнасці піваварнага завода пад кіраўніцтвам Рохлі Фрумкінай, амаль не захавалася. Вядома, што ў 1868 г. на ім было выраблена звыш 14,7 тыс. дэкалітраў піва на суму 12 тыс. рублёў[5]. Разам з тым матэрыялы справаводства, якія змяшчаюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, даюць магчымасць аднавіць жыццёвы шлях уладальніцы завода. Яна нарадзілася ў 1816 г. у Мінску. Па веравызнанні была іўдзейкай. На момант атрымання зямельнага надзела ў спадчыну ад бацькі Рохля Мінекер ўжо была замужам за мінскім мяшчанінам Борухам Фрумкіным. У шлюбе ў іх нарадзіліся чатыры дачкі і дзесяць сыноў[6]. Аднак сямейныя абавязкі не перашкодзілі таму, каб на працягу больш чым дзесяці гадоў Рохля Фрумкіна займалася ўсімі справамі завода. Знаходжанне жанчыны на чале такой вытворчасці ў тыя часы можа ўжо само па сабе лічыцца адной з адметнасцей разглядаемага прадпрыемства. Зразумела, што ў сучасных умовах, калі гендарная роўнасць уяўляе звыклую для нашага грамадства з'яву, гэта можа і не ўспрымацца як нешта асаблівае. Але паўтары стагоддзі таму сітуацыя была крыху іншай. Безумоўна, у Расійскай імперыі, у адрозненне ад краін Заходняй Еўропы таго часу, на баку жанчыны было камерцыйнае заканадаўства, паводле якога не існавала гендарных абмежаванняў у занятках прадпрымальніцтвам. Істотным крокам у гэтым кірунку стала прыняцце 10 чэрвеня 1857 г. заканадаўчага акта, паводле якога прадстаўніцы купецкага саслоўя маглі атрымліваць пасведчанні на ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці, якая не абавязкова была звязана са справай іх мужоў[7]. Крыху менш чым праз шэсць гадоў гендарная роўнасць у занятках прадпрымальніцтвам распаўсюдзілася на ўсе саслоўі. У адпаведнасці з артыкулам 21 Палажэння аб пошлінах за права гандлю і іншых промыслаў ад 1 студзеня 1863 г. пасведчанні на занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю маглі набывацца незалежна ад саслоўнага паходжання асобамі абодвух палоў, якія мелі расійскае або замежнае падданства[8]. Але нават нягледзячы на той факт, што расійскае права, якое рэгламентавала асновы прадпрымальніцкай дзейнасці, было ліберальным у адносінах пола-ўзроставых прыкмет заснавальнікаў прадпрыемстваў, доля жанчын у прамысловай вытворчасці заставалася нязнач-

[3]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 97–97 адв.
[4]Там жа. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 44–44 адв.
[5]Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1935. Арк. 97–97 адв.
[6]Там жа. Ф. 147. Воп. 1. Спр. 25105. Арк. 6, 13.
[7]Высочайше утвержденное мнение государственного Совета от 10 июня 1857 г. № 31974 «О дозволении выдавать купеческим женам свидетельства для производства отдельной от мужей их торговли» // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1858. Т. 32 : 1857, отд. 1. С. 531.
[8]Положение о пошлинах за право торговли и других промыслов от 1 января 1863 г. № 39118 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. СПб., 1866. Т. 38 : 1863, отд. 1. С. 7.

най. Так, у 1879 г. па ўсёй Расійскай імперыі толькі 1045 з 26 067 прадпрыемстваў (4 %) належалі жанчынам. Да 1897 г. удзельная вага «жаночых» прамысловых устаноў павялічылася да 4,8 % [4, с. 203], але гэты паказчык усё адно быў нязначным.

Заснавальніца піваварнага завода кіравала ім на працягу 12 гадоў. За гэты час яна стала ўдавой, а 10 лютага 1876 г. ва ўзросце 60 гадоў і сама памерла ад пухліны галаўнога мозга. Варта адзначыць, што да моманту ўзнікнення спадчынных правоў дажылі толькі 12 з 14 дзяцей Рохлі і Боруха Фрумкіных. Двум з іх – Арону і Неваху – астатнія дзесяць прамых спадкаемцаў саступілі свае правы на ўсю рухомую і нерухомую маёмасць[9]. З гэтага часу пачынаецца новы этап у развіцці гэтага прадпрыемства. Браты Фрумкіны энергічна працягвалі справу сваёй маці. Напрыканцы 1870-х гг. сярод 15 піваварных заводаў Мінскай губерні іх прадпрыемства заняло другое месца па аб'ёме вытворчасці. У 1879 г. на бровары братоў Фрумкіных было выраблена амаль 24 тыс. дэкалітраў піва на суму 18 тыс. рублёў[10]. У гэты час іх галоўнымі канкурэнтамі былі ўладальнікі самых магутных на той час піваварных заводаў у пяці беларускіх губернях – віленскія купцы першай гільдыі Вільгельм Шапэн і Ілля Ліпскі. У 1879 г. на заводзе В. Шапэна ў раёне Лукішак было выраблена звыш 263 тыс. дэкалітраў піва, а агульны аб'ём вытворчасці ў грашовым выражэнні склаў 193 тыс. рублёў, на заводзе І. Ліпскага – 123 тыс. дэкалітраў піва агульным коштам 80 тыс. рублёў. У канцы XIX – пачатку XX ст. гэтыя прадпрыемствы працягвалі нарошчваць сваю магутнасць шмат у чым дзякуючы пераходу ад аднаасобнай да асацыіраванай формы вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці. У 1902 г. было заснавана акцыянернае таварыства паравога піваварнага завода «І. Е. Ліпскі». На Лукішскім жа бровары ўвогуле змяніўся гаспадар. Ім стаў віленскі купец першай гільдыі Мордух Эпштэйн. У 1897 г. ён разам са сваім сынам Веньямінам і баронам Феліксам фон-Гейманам заснаваў «Віленскае акцыянернае таварыства "Шапэн"». Рэарганізацыя бізнесу дазволіла прадстаўнікам дзелавой эліты Віленшчыны захаваць лідзіруючыя пазіцыі ў вытворчасці піва. Так, у 1910 г. на заводзе І. Ліпскага было выраблена прадукцыі на суму звыш 500 тыс. рублёў, на заводзе М. Эпштэйна – амаль на 417 тыс. рублёў[11].

Узрастаючая канкурэнцыя з боку віленскіх вытворцаў піва вымушала братоў Фрумкіных шукаць шляхі да пашырэння вытворчых магчымасцей свайго прадпрыемства. Для гэтага ў 1879 г. Арон і Невах заключылі 4 дагаворы з Мінскай гарадской управай, паводле якіх атрымалі ў арэнднае карыстанне на 30 гадоў чатыры сумежныя зямельныя надзелы агульнай плошчай звыш 9,28 тыс. м$^2$. Размяшчаліся яны на перакрыжаванні вуліц Загараднай і Аляксандраўскай – на процілеглым баку (у дыяганальным вектары) ад іх бровара[12]. На арэндных землях з цягам часу былі ўзведзены гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы, у тым ліку саладоўня і лядоўня, якія былі неабходны для ўдасканалення працэсу піваварэння. Вынікі зробленых братамі Фрумкінымі пераўтварэнняў уражваюць. У 1885 г. на іх прадпрыемстве было выраблена звыш 98 тыс. дэкалітраў піва, што ў 4 разы больш у параўнанні з паказчыкам 1879 г. Сумарны кошт выробленай прадукцыі склаў 52 тыс. рублёў[13]. У разглядаемы час прадпрымальніцкая дзейнасць давала магчымасць пэўным прамыслоўцам, гандлярам ці крэдыторам не толькі ўзбагаціцца, але і ўзняцца па іерархічнай лесвіцы [5, с. 157]. Адпаведна з ростам вытворчых паказчыкаў бровара змяніўся і сацыяльны статус Арона і Неваха Фрумкіных. Калі ў 1879 г. яны фігуравалі як прадстаўнікі мяшчанскага саслоўя, то ў 1885 г. – ужо як мінскія купцы другой гільдыі, што, безумоўна, сведчыць аб іх сацыяльным узвышэнні.

У 1890 г. прадпрыемства братоў Фрумкіных заняло першае месца па аб'ёме выраблենай прадукцыі сярод піваварных заводаў Мінскай губерні і чацвёртае месца ў піваварнай вытворчасці пяці беларускіх губерняў, якая на той час аб'ядноўвала 113 адпаведных прамысловых аб'ектаў[14]. Дасягненне пэўных вышынь не спыніла дзелавой актыўнасці гаспадароў разглядаемага прадпрыемства. 29 лістапада 1892 г. Арон і Невах Фрумкіны афармілі на сваіх жонак Дразну і Шэйну даверанасці, згодна з якімі жанчыны сталі не толькі паверанымі сваіх мужоў, але і атрымлівалі правы здзяйсняць купчыя і закладныя крэпасці, заключаць кантракты і атрымліваць па іх грошы, кіраваць прадпрыемствам, а пры неабходнасці – прадаць і закласці ў поўным аб'ёме як рухомую, так і нерухомую маёмасць гэтага вытворчага комплексу, здаць яго ў арэнду[15] і г. д. Уяўляецца, што дадзеныя дакумен-

[9]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 147. Воп. 1. Спр. 25105. Арк. 6–7 адв. ; Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1553. Арк. 14.
[10]Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским: материалы для фабрично-заводской статистики / под ред. П. А. Орлова. СПб., 1881. С. 536.
[11]Указатель фабрик и заводов Европейской России с Царством Польским и Великим княжеством Финляндским: материалы для для фабрично-заводской статистики. С. 528 ; Указатель действующих в Империи акционерных предприятий и торговых домов : в 2 т. / под ред. В. А. Дмитриева-Мамонова. СПб., 1905. Т. 1. С. 159, 170 ; Список фабрик и заводов Российской Империи : в 2 ч. / под ред. В. Е. Варзара. СПб., 1912. Ч. 2. С. 139, 141.
[12]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1552. Арк. 3–6 адв. ; Там жа. Спр. 1553. Арк. 4–9.
[13]Там жа. Ф. 21. Воп. 1. Спр. 34. Арк. 74.
[14]Указатель фабрик и заводов Европейской России : материалы для фабрично-заводской статистики / под ред. П. А. Орлова, С. Г. Будагова. СПб., 1894. С. 656–660, 669–670.
[15]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2489. Арк. 2–2 адв.

ты былі аформлены з мэтай павысіць мабільнасць уладальнікаў завода, паколькі дасягненне поспехаў у занятках прадпрымальніцтвам было немагчымым без ведання месцаў, шляхоў і сродкаў збыту прадукцыі, запатрабаванняў спажыўцоў у розных мясцовасцях, спрыяльнага часу для куплі сыравіны і продажу гатовай прадукцыі. Зразумела, што, пастаянна знаходзячыся на прадпрыемстве, атрымаць такую інфармацыю на той час было амаль немагчымым.

Менш чым праз месяц пасля афармлення даверанасцей Дразна і Шэйна Фрумкіны звярнуліся ў Мінскую гарадскую ўправу з прашэннем аб выкупе двух зямельных участкаў агульнай плошчай 3,64 тыс. м$^2$, якія з 1879 г. знаходзіліся ў арэндным карыстанні іх мужоў. Перашкод з боку выканаўчага органа мясцовага самакіравання не ўзнікла. 28 студзеня 1893 г. было прынята рашэнне аб выдачы Шэйне і Дразне Фрумкіным натарыяльнага акта (купчай крэпасці) аб набыцці ва ўласнасць адпаведнага надзелу зямлі пасля выплаты імі 1020 рублёў срэбрам. Аднак, як высветлілася, патрэбнай сумы грошай у прасіцеляў не было, таму яны звярнуліся за пазыкай у банкірскую кантору «Вейсбрэм і Поляк», якая была самай старэйшай і найбуйнейшай на той час у Мінску. Атрымаўшы гарантыі ад крэдытораў, паверанныя братоў Фрумкіных накіравалі новае прашэнне ў Мінскую гарадскую ўправу. У сувязі з тым, што 895 з неабходных 1020 рублёў будуць унесены прадстаўнікамі банкірскай канторы, Шэйна і Дразна Фрумкіны прасілі выдаць натарыяльны акт на імя Вейсбрэма і Поляка[16]. Грошы былі ўнесены ў гарадскую казну, аднак купчая так і не была выдадзена. Прычынай гэтага стаў той факт, што 11 лютага 1893 г. Мінскай гарадской управай была распачата працэдура па спыненні зямельных арэндных адносін з Фрумкінымі і прызнанні за горадам права ўласнасці на зямлю, якую арэндавалі з 1879 г. піваварныя заводчыкі. 31 сакавіка 1893 г. служачы Мінскага акружнога суда разам з паверанным Мінскай гарадской управы правялі апытанне мяшчан, якія жылі на землях, размешчаных побач з часовымі ўладаннямі Фрумкіных. У пратаколах адзначалася, што гараджане, якіх апытвалі, ведалі аб тым, што гэтыя зямельныя надзелы здаўна належалі Мінскай гарадской управе, але на працягу апошніх амаль 15 гадоў знаходзіліся ў арэндным карыстанні Фрумкіных. Фактычна гэтага хапіла для таго, каб спыніць дзеянне дагавораў ад 1879 г.[17] Такім чынам, уладальнікі прадпрыемства страцілі не толькі частку зямельнага надзела, але і важныя для вытворчасці піва пабудовы – саладоўню і лядоўню, што не магло не адбіцца на іх далейшай дзейнасці.

Дарэчы, названыя прадпрымальнікі былі не адзінымі, з кім датэрмінова спынялі арэндныя зямельныя адносіны мінскія ўлады. Так, уладальнік найбуйнейшага на той час на тэрыторыі Беларусі чыгуналіцейнага і машынабудаўнічага завода Нісан Якабсон ажыццяўляў сваю дзейнасць на землях, якія знаходзіліся ў трыццацігадовым арэндным карыстанні па кантрактах з Мінскай гарадской управай ад 1881, 1885 і 1887 г. 1 лютага 1893 г. мінскія ўлады распачалі працэдуру спынення арэндных адносін і з гэтым прамыслоўцам, якая адбывалася па такім жа сцэнарыі, як з Фрумкінымі. Падставай для скасавання дагавораў арэнды стала быццам бы пастанова Мінскай гарадской думы ад 25 верасня 1889 г.[18] Аднак пры ўважлівым азнаямленні з кнігай нарматыўна-прававых актаў названага прадстаўнічага органа ўлады за 1889 г., якая захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі[19], адзначанае пастанаўленне выяўлена не было. Можна выказаць толькі меркаванне, што датэрміновае спыненне арэндных адносін ставіла сваёй мэтай павышэнне зямельнай рэнты і прыцягненне дадатковых сродкаў у гарадскі бюджэт. І зразумела, што буйныя прадпрымальнікі, такія як Н. Якабсон, маглі пайсці і ішлі на заключэнне кантрактаў на арэнду зямлі на новых умовах. Разам з тым для Фрумкіных, у якіх відавочна ў пачатку 1890-х гг. узніклі пэўныя фінансавыя цяжкасці, такія змены маглі прывесці да страты сямейнага бізнесу. Яны страцілі адзіную магчымасць атрымання сталага прыбытку, а у 1893 г. за пазыкі розным асобам уся рухомая і нерухомая маёмасць братоў Арона і Неваха, у тым ліку спадчынныя і былыя арэндныя зямельныя надзелы, былі выстаўлены на публічныя таргі.

Паваротным момантам у далейшым развіцці прадпрыемства з'яўляецца 28 ліпеня 1893 г., калі новым уладальнікам бровара стаў граф Караль Ян Аляксандр Гутэн-Чапскі – вядомы дзяржаўны дзеяч, прадпрымальнік, філантроп, Мінскі гарадскі галава ў 1890–1901 гг. За 32 тыс. рублёў срэбрам ён набыў два зямельныя надзелы агульнай плошчай звыш 17 тыс. м$^2$, якія знаходзіліся на процілеглых баках перакрыжавання вуліц Старажоўскай (былой Загараднай) і Аляксандраўскай. Акрамя таго, ва ўласнасць Караля Эмерыкавіча Чапскага перайшоў піваварны завод, які размяшчаўся на момант продажу ў двух драўляных карпусах, а таксама ўсе неабходныя для вытворчасці піва пабудовы і абсталяванне: саладоўні, лядоўні, вадакачка, каменная сушыльня, млын, медныя катлы, чаны, краны, драўляныя бочкі, каля 2 тыс. бутэлек, 4 падводы[20] і інш. Пры гэтым у снежні 1893 г. набытыя графам Чапскім зямельныя ўладанні па тэрміну даўнасці

[16]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2489. Арк. 1, 3, 4.
[17]Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1552. Арк. 1, 13–20 адв.
[18]Там жа. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1563. Арк. 1–3, 5, 6, 8, 11, 21.
[19]Там жа. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 3592.
[20]Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2489. Арк. 6–7.

былі прызнаны ўласнасцю г. Мінска[21], за карыстанне якой Караль Эмерыкавіч павінен быў штогод у гарадскую казну ўносіць арэндную плату.

Перыяд, калі піваварным заводам валодаў граф Караль Чапскі, бадай што самы папулярызаваны ў айчыннай гістарыяграфіі. Не апошнюю ролю ў гэтым адыграў яскравы вобраз мэра-наватара, пры якім адбылося ўдасканаленне інфраструктуры г. Мінска, з'яўленне электрычнага асвятлення і распаўсюджанне тэлефоннай сеткі, заснаванне шэрагу ўстаноў для сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва; скончана будаўніцтва Першага гарадскога тэатра, велатрэка і стадыёна з комплекснымі спартыўнымі збудаваннямі ў Губернатарскім парку і інш. Граф Чапскі рашуча ўзяўся і за мадэрнізацыю набытага ім бровара. Па яго ініцыятыве быў падрыхтаваны план пабудовы новага каменнага корпуса завода, які адпавядаў тагачасным тэхнічным патрабаванням. У дадатак да гэтага павінны былі з'явіцца новыя вытворчыя будынкі, памяшканні для працоўных, падземны трубаправодны канал і г. д., якія ў сукупнасці з існаваўшымі пабудовамі Фрумкіных павінны былі скласці аснову новага вытворчага комплексу (мал. 2). Дарэчы, захаванне старой піваварні, каменнай саладоўні з драўлянай адрынай і свірнам і іншых пабудоў, якія былі ўзведзены пры ранейшых уладальніках, былі абавязковай умовай для атрымання пазыкі ў пазямельным банку, за якой у 1894 г. звярнуўся паверaны графа Чапскага Ксаверый Ельскі. Пасля атрымання графам Каралем Чапскім 14 красавіка 1894 г. дазволу на ўзвядзенне ўсіх неабходных пабудоў пачынаецца праца па рэалізацыі плана ўдасканалення дадзенага прадпрыемства. У выніку на перакрыжаванні вуліц Старажоўскай і Аляксандраўскай з'явіўся новы корпус завода, які ў 1896 г. быў аснашчаны паравым рухавіком. У гэтым жа годзе прадпрыемства атрымала назву «Паравы піваварны завод "Багемія" Гр. К. Э. Чапскага ў Мінску»[22].




*Мал. 2.* Схема размяшчэння будынкаў на зямельных участках К. Чапскага (1894 г.):
1 – каменны піваварны завод з сушыльняй і саладоўняй; 2, 16 – драўляныя лядоўні; 3 – каменнае памяшканне для закісання піва; 4 – калодзеж; 5 – земляная лядоўня; 6, 19 – жылыя памяшканні для рабочых і кіраўніцтва завода; 7 – службовае памяшканне для рабочых; 8 – вадакачка; 9 – памяшканне для мыцця посуду і тары; 10 – каменная саладоўня; 11, 13 – драўляныя ледавікі (былыя карпусы піваварнага завода Фрумкіных); 12, 14, 17 – драўляныя адрыны; 15 – драўляная стайня; 18 – прыбіральня.
Крыніца: Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2724. Арк. 43 адв.

*Fig. 2.* The layout of buildings on K. Chapski's land plots (1894):
1 – stone brewery with drying chamber and a malt house; 2, 16 – wooden ice houses; 3 – stone brewery fermentation room; 4 – water well; 5 – in-ground ice house; 6, 19 – residential accommodation for factory workers and management; 7 – service space building for workers; 8 – pump-house; 9 – washing room for dishes and containers; 10 – stone malt house; 11, 13 – wooden ice houses (former buildings of Frumkin's brewery factory); 12, 14, 17 – wooden barns; 15 – wooden stable; 18 – restroom.
Source: National Historical Archives of Belarus. F. 1. Inv. 1. F. 2724. Sh. 43 rev.

[21] Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 183. Воп. 3. Спр. 1553. Арк. 31–32.
[22] Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2724. Арк. 42–43 ; Там жа. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 729. Арк. 53–54 адв. ; Там жа. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 133. Арк. 3.

Мадэрнізацыя вытворчасці, якая адбылася ў 1894 г., дала настолькі магутны імпульс для далейшага развіцця піваварні, што пэўныя даследчыкі нават пазначаюць гэты год у якасці часу заснавання прадпрыемства [1, с. 213]. Аднак уяўляецца, што факт узвядзення па ініцыятыве Караля Чапскага каменнага будынка завода не варта разглядаць у якасці новай кропкі адліку дзейнасці прадпрыемства, бо перанос асноўных вытворчых плошчаў пры захаванні функцыянальнага прызначэння старой вытворчасці не азначае спынення дзейнасці прадпрыемства, як і адбылося ў дадзеным выпадку. Больш за тое, граф Чапскі пры вырабе сваёй прадукцыі выкарыстоўваў не толькі вытворчы вопыт, але і функцыянальныя магчымасці піваварнага комплексу братоў Фрумкіных, у тым ліку пераабсталяваўшы ўзведзеную імі каменную саладоўню ў лядоўню, якая пры дапамозе падземнага трубаправоднага канала была звязана з вытворчым цэхам у новым будынку завода.

Граф Караль Чапскі заставаўся ўладальнікам прадпрыемства да моманту яго продажу ў 1898 г. баварскім падданым братам Мікалаю, Адаму і Францу Францавічам Лекертам[23]. На той момант гэтаму сямейству ўжо належалі два заводы ў Магілёўскай губерні. Першы быў заснаваны ў 1862 г. іх бацькам Францам Міхайлавічам Лекертам у Магілёве, другі – ім жа ў 1886 г. у Гомелі. У 1900 г. на двух названых прадпрыемствах было выраблена амаль 245,5 тыс. дэкалітраў піва на суму 177,2 тыс. рублёў[24]. З набыццём у графа Чапскага яго піваварнага завода браты Франц і Адам засяродзіліся ў асноўным на справах прадпрыемстваў у Магілёўскай губерні, а кіраўніцтва «Багеміяй» было сканцэнтравана ў руках Мікалая Лекерта.

Да нашага часу захавалася не так шмат звестак аб асобе гэтага прадпрымальніка, але іх дастаткова, каб скласці яго сацыяльны партрэт. Нарадзіўся будучы загадчык піваварнага завода «Багемія» 19 лістапада 1872 г. у Магілёве ў сям'і Франца і Магдалены Лекертаў. Нягледзячы на тое, што дзяцінства яго прайшло ў Расійскай імперыі, як баварскі падданы, ён адслужыў унтэр-афіцэрам у Другім уланскім палку Германскай арміі[25]. Паводле адных звестак, пасля выканання свайго вайсковага абавязку перад імперыяй Вільгельма II у 1898 г. ён прыняў расійскае падданства[26]. Паводле іншых, падданым Расійскай імперыі ён стаў толькі ў 1903 г., пасля таго як ажаніўся з дачкой ковенскага мяшчаніна Паўлай-Адэліяй Шлінгензіпен. У выніку гэтага міжканфесійнага шлюбу (Мікалай быў рыма-каталікам, Паўла – лютэранкай) у іх у 1904 г. нарадзіўся сын Мікалай-Адам-Макс, а ў 1906 г. – дачка Ільза. У 1907 г. яны ўсім сямействам былі прылічаны да купецкага саслоўя[27].

Варта адзначыць, што гэты шлюб, акрамя ўсяго іншага, заклаў аснову своеасаблівага сямейнага прадпрымальніцкага тандэма, у якім Паўла-Адэлія займалася справамі на месцы, а Мікалай дамаўляўся аб пастаўках сыравіны, новага абсталявання, збыце прадукцыі і г. д. На пачатку XX ст. кіраўніцтва заводам неаднаразова пераходзіла ад мужа да жонкі і наадварот. Аднак апошняй уладальніцай «Багеміі», як і яе заснавальніцай, была жанчына. Цяжка вызначыць канкрэтную дату, калі завод канчаткова перайшоў ва ўласнасць Паўлы Лекерт. Так, у спісе прамысловых прадпрыемстваў Расійскай імперыі за 1908 г. у якасці ўладальнікаў бровара пазначаны браты Лекерты[28]. З 1909 г. на афіцыйных бланках прадпрыемства замест эмблемы з надпісам «Піваварны завод "Багемія" Братоў Лекерт» з'явілася эмблема «Паравы піваварны завод "Багемія" П. Ю. Лекерт»[29]. Паўла-Адэлія фігуруе ў якасці ўладальніцы і ў спісах прамысловых устаноў Расійскай імперыі за 1910 г.[30]

Аб'ём вытворчасці на прадпрыемстве Лекертаў у 1900–1913 гг. павялічваўся. Калі ў 1900 г. на «Багеміі» было выраблена прадукцыі на суму амаль 120 тыс. рублёў, то ў 1908 г. – на 250 тыс. рублёў. У 1913 г. аб'ём вытворчасці ў грашовым выражэнні дасягнуў 350 тыс. рублёў пры аптовым кошце піва ад 5,5 да 8 капеек за літр (у залежнасці ад гатунку). Напярэдадні Першай сусветнай вайны мінская «Багемія» ўяўляла сабой дастаткова буйное прадпрыемства, якое было аснашчана пяццю паравымі і электрычным рухавікамі[31]. У гэты час уладанні сямейства Лекертаў уключалі ў сябе не толькі вытворчыя пабудовы (корпус завода, соладасушыльні, брадзільня, лядоўня і г. д.), будынак канторы завода, флігель для машыніста, бухгалтара і клермайстра, але і памяшканні (мал. 3), у якіх жылі працоўныя завода, яго ўладальнікі, а таксама іншыя асобы, якія проста мелі патрэбу ў кароткаі доўгатэрміновай арэндзе жылля[32].

[23]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1424. Воп. 3. Спр. 27. Арк. 149 адв.
[24]Список фабрик и заводов Европейской России / под ред. В. Е. Варзара. СПб., 1903. С. 584.
[25]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2389. Воп. 1. Спр. 15. Арк. 155 ; Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7282. Арк. 100 адв. – 101.
[26]Там жа. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9328. Арк. 8.
[27]Там жа. Ф. 380. Воп. 1. Спр. 580. Арк. 413–414.
[28]Список фабрик и заводов России. М., 1910. С. 601.
[29]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 133. Арк. 82.
[30]Список фабрик и заводов Российской Империи. С. 196.
[31]Список фабрик и заводов Европейской России. С. 577 ; Список фабрик и заводов России. С. 601 ; Фабрично-заводские предприятия Российской империи / ред. Ф. А. Шобер. Пг., 1914. № 6974Д.
[32]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4934. Арк. 30–36 ; Там жа. Спр. 4953. Арк. 122–128




*Мал. 3.* Схема размяшчэння будынкаў
на зямельных участках сямейства Лекертаў (1910 г.):
1 – каменны піваварны завод з сушыльняй і саладоўняй; 2 – драўляная лядоўня; 3, 5, 14 – жылыя памяшканні; 4 – палісаднік; 6 – бандарня;
7 – памяшканне для мыцця посуду і бочак; 8, 10, 11, 13 – адрыны; 9 – флігель;
12 – памяшканне для мыцця бутэлек і разліву піва.
Крыніца: Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4934.
Арк. 30–36 ; Там жа. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 4953. Арк. 122–128

*Fig. 3.* The layout of the placement
of buildings on the Lekkerts' family land plots (1910):
1 – stone brewery with drying chamber and a malt house; 2 – wooden ice house;
3, 5, 14 – residential accommodation; 4 – front garden; 6 – cooperage;
7 – washing room for dishes and kegs; 8, 10, 11, 13 – barns; 9 – outbuilding;
12 – room for washing bottles and beer bottling.
Source: National Historical Archives of Belarus.
F. 1. Inv. 1. F. 4934. Sh. 30–36 ; Ibidem. F. 1. Inv. 1. F. 4953. Sh. 122–128

Павелічэнне вытворчых магутнасцей адбывалася паралельна з ростам колькасці занятых на прадпрыемстве працоўных. Калі ў 1900 г. штат рабочых піваварнага завода складаў 33 чалавекі, то ў 1913 г. – ужо 75. Няўхільнае павелічэнне колькасці рабочых на прадпрыемстве вымагала ад прадпрымальнікаў правядзення адмысловай сацыяльнай палітыкі, у тым ліку і ў адпаведнасці з патрабаваннямі працоўнага заканадаўства. Так, з 1898 г. работнікі «Багеміі» маглі атрымаць медыцынскую дапамогу ў сценах завода або ў хатніх умовах, пры сур'ёзных захворваннях – маглі быць шпіталізаваны ў гарадскую бальніцу за кошт уладальнікаў завода. Пры гэтым ім выплачвалася грашовая дапамога па хваробе ў памеры 50 % ад заробку[33]. Уладальнікі піваварнага завода прытрымліваліся і норм закона «Аб працягласці і размеркаванні працоўнага часу ва ўстановах фабрычна-заводскай прамысловасці» ад 2 чэрвеня 1897 г., паводле якога працоўны час не павінен быў перавышаць 11,5 гадзіны ўдзень і 10 гадзін уначы[34]. У 1904 г. рабочыя мінскай «Багеміі», якія былі заняты ў бесперапынных працэсах, працавалі ў дзве змены па 10 гадзін у суткі, астатнія – у адну змену 11 гадзін у суткі. Пры такой працягласці працоўнага дня не дапамагаў нават дармавы куфаль піва, які, згодна з правіламі ўнутранага распарадку, рабочыя маглі ўжыць на тэрыторыі завода. Паляпшэнне ўмоў працы стала магчымым толькі падчас падзей Першай расійскай рэвалюцыі. 19 лютага 1905 г. на піваварным заводзе пачаўся страйк. Рабочыя патрабавалі скарачэння працоўнага дня на 2 гадзіны, павелічэння дзённай аплаты працы на 10 капеек, а таксама выплаты дапамогі ў выпадку хваробы ў памеры 100 % ад іх заробку. У такіх умовах прадпрымальнікі вымушаны былі пайсці насустрач страйкерам. Аднак задаволілі Лекерты патрабаванні толькі часткова – працягласць працоўнага дня была зменшана на 1 гадзіну, аплата працы была павялічана на 3,33 капейкі ў дзень, а дапамога ў выпадку хваробы засталася на ранейшым узроўні. Тым не менш гэтым крокам заводчыкі здолелі з 28 лютага 1905 г. вярнуць пралетарыят на яго працоўнае месца. Варта адзначыць, што пасля заканчэння рэвалюцыйных падзей працягласць працоўнага часу была ўсталявана на ранейшым узроўні[35].

[33]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 133. Арк. 14.
[34]Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета «О продолжительности и распределении рабочего времени в заведениях фабрично-заводской промышленности» от 2 июня 1897 г. № 14231 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 3 : в 33 т. СПб., 1900. Т. 17 : 1897. С. 355–356.
[35]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 133. Арк. 48, 57–59, 97.

Саступкі працоўным, якія былі зроблены Лекертамі ў лютым 1905 г., дазволілі ім на працягу далейшых рэвалюцыйных гадоў упэўнена рухацца да павелічэння вытворчасці і нарошчвання аб'ёмаў збыту прадукцыі, які адбываўся пры дапамозе розных піцейных устаноў. Толькі ў сакавіку – кастрычніку 1905 г. гэтыя прадпрымальнікі атрымалі дазвол на адкрыццё 10 новых гандлёвых кропак у розных населеных пунктах Мінскай губерні[36]. Калі звярнуцца да кніг разліку з прыказчыкамі піўных лавак, якія належалі Лекертам, то можна ўбачыць, што геаграфічна яны размяшчаліся не толькі ў межах Мінскай губерні, але і на суседніх тэрыторыях. Прадукцыя мінскай «Багеміі» была запатрабавана мясцовым насельніцтвам. Найбольш папулярнымі гатункамі сярод спажыўцоў былі «Пільзенскае», затым «Сталовае» і «Царскае», а найменш папулярным было традыцыйнае нямецкае моцнае піва «Бокбір». Аптовы кошт «Сталовага» вагаўся ад 5,5 да 6,5 капеек, «Пільзенскага» – ад 6,5 да 7,5 капеек, «Царскага» і «Бокбір» ад 7 да 8 капеек за літр[37]. Збыт ажыццяўляўся не толькі ў піцейных установах, але і пры дапамозе пасрэднікаў, якія займаліся продажам прадукцыі Лекертаў у Гданьску, Волме, амаль ва ўсіх цэнтрах беларускіх губерняў і большасці павятовых гарадоў у межах сучаснай Беларусі. Для транспарціроўкі прадукцыі ў суседнія губерні выкарыстоўвалася чыгунка[38].

Як ужо адзначалася, у 1913 г. піваварны завод «Багемія» ўяўляў сабой дастаткова буйное прадпрыемства. Па аб'ёме вытворчасці ён займаў першае месца ў Мінскай і трэцяе ў пяці беларускіх губернях, саступаючы толькі акцыянернаму таварыству піваварнага завода «І. Е. Ліпскі» і віленскаму акцыянернаму таварыству піваварэння «Шапэн», на кожным з якіх у гэты час было выраблена прадукцыі на суму 1 млн рублёў[39]. Аднак Першая сусветная вайна, якая пачалася ў ліпені 1914 г., унесла істотныя карэктывы ў далейшае развіццё мінскай «Багеміі».

Як вядома, ва ўмовах Першай сусветнай вайны на большасці фабрычна-заводскіх устаноў у беларускіх губернях быў зменшаны аб'ём вытворчасці па прычыне цяжкасцей у збыце прадукцыі і атрыманні новага абсталявання, а таксама з-за недахопу сыравіны. Негатыўна адбілася на дзейнасці прадпрыемстваў асноўных падаткафарміруючых галін прамысловасці Беларусі ўвядзенне сухога закона. У першыя месяцы вайны піва не трапіла ў спіс забароненай для выпуску прадукцыі, таму Лекерты працягвалі займацца вытворчасцю традыцыйных на іх заводзе гатункаў «Ідэал», «Сталовае», «Пільзенскае», «Бокбір», «Мюнхенскае» і «Царскае». Для транспарціроўкі прадукцыі яны выкарыстоўвалі чыгунку[40], нягледзячы на тое, што з абвяшчэннем усеагульнай мабілізацыі многія станцыі спынілі прыём і адпраўленне прыватных грузаў. Аднак прыняцце 31 снежня 1914 г. распараджэння ўрада «Аб павышэнні акцызу з півавараэння»[41] вымусіла прадпрымальнікаў перапрафіляваць вытворчасць. Варта адзначыць, што яшчэ з верасня 1914 г. Лекерты паралельна з вытворчасцю піва ажыццяўлялі выраб сухароў[42], якія карысталіся попытам ва ўмовах ваеннага часу. Павышэнне ж акцызаў на піва прывяло да таго, што 30 студзеня 1915 г. Паўла Лекерт звярнулася ў Мінскае гарадское праўленне з прашэннем аб адкрыцці на тэрыторыі завода цэха для вытворчасці газіраваных фруктовых вод і ліманаду. Прашэнне было задаволена 1 красавіка 1915 г.[43]

Набліжэнне лініі фронту ў кастрычніку 1915 г. да Мінскай губерні ўнесла карэктывы і ў далейшае сямейнае жыццё прадпрымальнікаў. Зачыстка прыфрантавой зоны ад шпіёнаў і ворагаў імперыі закранула і Лекертаў. Былы баварскі падданы Мікалай Лекерт, як і яго цесць Юліус Шлінгензіпен, былі западозраны ў сувязях з германскай разведкай. Нягледзячы на ўсе прашэнні Паўлы-Адэліі, 29 чэрвеня 1916 г. яе муж і бацька былі сасланы ў Іркуцкую губерню[44]. Але гэты факт не спыніў дзейнасць мінскай «Багеміі». Вытворчасць на ёй працягвалася да пачатку так званай «другой акупацыі тэрыторыі Беларусі» ў лютым 1918 г. Аднавілася дзейнасць прадпрыемства бліжэй да вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх акупантаў[45], аднак гэта ўжо была новая старонка ў гісторыі прадпрыемства, якая звязана з яго далейшай нацыяналізацыяй і развіццём на тэрыторыі савецкай Беларусі.

Такім чынам, развіццё мінскага піваварнага завода Фрумкіных – Чапскага – Лекертаў мела шэраг адметнасцей. На працягу большасці гадоў свайго існавання ў дарэвалюцыйны перыяд дадзенае прадпрыемства з'яўлялася лідарам у піваварнай вытворчасці Мінскай губерні. У пяці беларускіх губернях яно саступала віленскім вытворцам піва, але ў сучасных межах Беларусі па аб'ёме вытворчасці

[36]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7528. Арк. 251, 257, 275 ; Там жа. Спр. 7529. Арк. 85, 86, 119, 141, 153.
[37]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 453. Воп. 1. Спр. 72. Арк. 2–174 ; Там жа. Спр. 84. Арк. 14–401.
[38]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 453. Воп. 1. Спр. 85. Арк. 1–30 ; Там жа. Спр. 39. Арк. 1–130.
[39]Фабрично-заводские предприятия Российской империи. № 6567Д, 6576Д, 6974Д.
[40]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 453. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 93–135.
[41]Собрание узаконений и распоряжений правительства, издаваемое при Правительствующем Сенате. Петроград, 1915. Отд. 1. № 3543.
[42]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 133. Арк. 175 адв.
[43]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 299. Воп. 3. Спр. 1787. Арк. 1–3.
[44]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 9328. Арк. 8, 9, 13, 16, 17, 26.
[45]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 453. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 2–26.

ў грашовым выражэнні ў канцы XIX – пачатку XX ст. роўных яму не было. Адметнымі былі і ўладальнікі бровара, якія па сваіх сацыяльных характарыстыках адносіліся да розных катэгорый насельніцтва. Аднак ні прыналежнасць да пэўнага саслоўя ці канфесіі, ні полава-ўзроставыя адрозненні не былі перашкодай для ўваходжання ў склад дзелавога свету тагачаснай Беларусі. Выключна актыўная прадпрымальніцкая дзейнасць гэтых суб'ектаў гаспадарання з'яўлялася перадумовай дасягнення імі поспехаў у эканамічнай сферы жыцця. Усё гэта дазваляе зрабіць выснову аб тым, што развіццё прадпрымальніцтва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. у сукупнасці з іншымі фактарамі аказала істотны ўплыў на трансфармацыйныя змены ў беларускім грамадстве, якія сталі сацыяльнай асновай нацыянальна-дзяржаўных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Шыбека ЗВ. *Минскъ сто гадоў таму.* Мінск: Беларусь; 2007. 304 с.
2. Полетаева НИ. *Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX вв.* Минск: БГЭУ; 2004. 247 с.
3. Кукуня О. Старейший пивоваренный завод в Минске. В: *Жыццё айчыне, гонар нікому: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння Эмерыка фон Гутэн-Чапскага; Мінск, Беларусь, 16–18 сакавіка 2009 г.* Минск; 2010. с. 67–69.
4. Ульянова ГН. Государство и женщины-предприниматели в Российской империи в XIX в. В: *Российская государственность: опыт 1150-летней истории: материалы Международной научной конференции; Москва, Россия, 4–5 декабря 2012 г.* Москва; 2013. с. 199–210.
5. Каханоўскі АГ. *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.).* Мінск: БДУ; 2013. 335 с.

## References

1. Shybeka ZV. *Minsk sto gadou tamu* [Minsk a hundred years ago]. Minsk: Belarus; 2007. 304 p. Belarusian.
2. Poletaeva NI. *Kupechestvo Belarusi: 60-e gg. XIX – nachalo XX vv.* [Merchants of Belarus: 60$^{th}$ years XIX – the beginning of XX centuries]. Minsk: Belarusian State Economic University; 2004. 247 p. Russian.
3. Kukunya O. [The oldest brewery in Minsk]. In: *Zhyccjo ajchyne, gonar nikomu: matjeryjaly Mizhnarodnaj navukovaj kanferjencyi, prysvechanaj 180-goddzju z dnja naradzhjennja Jemeryka fon Gutjen-Chapskaga; Minsk, Belarus', 16–18 sakavika 2009 g.* [The Life to the Fatherland, the Honor to anyone: materials of the international scientific conference dedicated to the 180$^{th}$ anniversary of the birth of Emerick von Gutten-Chapsky; Minsk, Belarus, 2009 March 16–18]. Minsk; 2010. p. 67–69. Russian.
4. Ul'yanova GN. [Public Policy Towards Female Entrepreneurs in Nineteenth-Century Russian Empire]. In: *Rossiiskaya gosudarstvennost': opyt 1150-letnei istorii: materialy Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentsii; Moskva, Rossia, 4–5 dekabrya 2012 g.* [Russian Statehood: the 1150-Year Experience: materials of the International Scientific conference; Moscow, Russia, 2012 December 4–5]. Moscow; 2013. p. 199–210. Russian.
5. Kakhanouski AG. *Satsyyal'naya transfarmatsyya belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.)* [Social transformation of the Belarusian society (1861–1914)]. Minsk: Belarusian State University; 2013. 335 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.06.2018.*
*Received by editorial board 25.06.2018.*